*Дадатак 4. Месцы захоўвання гравюры «Vera Designatio Urbis in Littavia Grodnæ».*

| № | Месца захоўвання | Наклад (па літары S) | Мова тэкстаў | Асаблівасці асобніка | Гісторыя асобніка | Інвентарны нумар |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | VALDOVŲ RŪMAI Палац вялікіх князеў літоўскіх (Вільнюс, Літва) | 1 | лацінская | - | Паходзіць з калекцыі Томаша Неваднічанскага. | VR-1 |
| 2 | Zamek Królewski w Warszawie (Варшава, Польшча) | 1 | лацінская | Складаецца з 2-х несклееных частак | Паходзіць з калекцыі Томаша Неваднічанскага. | 5241 |
| 3 | Zamek Królewski w Warszawie (Варшава, Польшча) | 2 | нямецкая | Пасля рэстаўрацыі. аўтэнтычная частка каля 2/3 медзярыта. Складаецца з 4 аркушаў паперы | Паходзіць з калекцыі Томаша Неваднічанскага. | - |
| 4 | Biblioteka Narodowa w Warszawie (Варшава, Польшча) | 1 | нямецкая | - | Асобнік быў знойдзены ў Швецыі і выстаўлены ў 2008 годзе на аукцыёне «Lamus», дзе быў набыты Poczta Polska. | G.68165 |
| 5 | Muzeum Narodowe w Krakowie (Кракаў, Польшча) | 1 | лацінская | - | З канца XIX стагоддзя захоўваўся ў калекцыі князей Чартарыйскіх. | MNK XV-R 7024 |
| 6 | Львівська національна Наукова бібліотека імені В.Стефаника НАН України (Львоў, Украіна) | 1 | лацінская | Наклеены на кардон | У сярэдзіне XIX стагоддзя быў набыты галіцыйскім калекцыянерам Гвалбертам Паўлікоўскім. | - |
| 7 | Дзяржаўны музей выяўленчых мастацтваў ім А. С. Пушкіна (Масква, Расія) | 2 | нямецкая | Складаецца з 4-х аркушаў. | Можа паходзіць з маскоўскай калекцыі гравюр А. В. Марозава. | ГР75535 |
| 8 | Kungliga biblioteket Каралеўская бібліятэка Швецыі (Стакгольм, Швецыя) | 1 | лацінская | Пашкоджаны на месцы згібаў | З XVII стагоддзя асобнік уваходзіць ў склад бібліятэкі шведскага графа і рыксканцлера Магнуса Габрыэля Дэлагардзі. | Maps and Pictures DelaG E. 166 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 9 | Брытанскі музей (Лондан, Вялікабрытанія) | 2 | нямецкая | Фальсіфікат (?). Мае асаблівасці, характэрныя для высокага друку | Асобнік быў набыты ў 1883 годзе ў калекцыянера і ўладара аўкцыйнага дома ў Штутгарце Генрыха Георга Гутенкуста. | 1883,0811.33 |
| 10 | Імператарская публічная бібліятэка (Санкт-Пецярбург, Расія) | 2 | нямецкая | Складаецца з 4-х аркушаў. | Страчаны. Экзэмпляр быў набыты ў 1879 годзе ў кнігапрадаўцы Кона з Берліна за 200 марак дырэктарам Імператарскай публічнай бібліятэкі графам Мадэстам Корфам. Лёс экзэмпляра пасля 1917 года невядомы. | - |